ПА СУЧАСНЫХ СТАНДАРТАХ ГАНДЛЮ

Адно з найлепшых гандлёвых прадпрыемстваў не толькі ў Мазырскім раёне, але і ў Гомельскай вобласці, гандлёвая кампанія «Палессе» штогод нарошчвае тавараабарот, працуе з прыбыткам і інвестуе сродкі ў мадэрнізацыю і новае абсталяванне. Сёння гэта кампанія новага тыпу, дзе стыль работы і ўзровень абслугоўвання адпавядаюць сучасным стандартам. Па выніках паказчыкаў сацыяльна-эканамічнага развіцця прадпрыемства стабільна ўваходзіць у лік найлепшых у рэгіёне.

— Летась тэмп росту асноўнага паказчыка — рознічнага таваразвароту — нашай гандлёвай сеткі ў супастаўных цэнах склаў 106,7 %, што больш чым на 5 % перавышае заданне, — расказвае **дырэктар Мазырскай гандлёвай кампаніі «Палессе» Наталля СЕМЯНЮК.** — Тэмп рознічнага таваразвароту прадпрыемстваў грамадскага харчавання ў супастаўляльных цэнах — 139 % пры даведзеным заданні 101,2 %. Рэнтабельнасць продажаў склала 1,54 %. Выкананне таваразвароту і іншых паказчыкаў, стабільная работа нашага прадпрыемства дазволілі атрымаць прыбытак і абаротныя сродкі для вядзення гаспадарчай дзейнасці. Важна, што мы выконваем свае абавязацельствы і не маем пратэрмінаванай дэбіторскай і крэдыторскай запазычанасці. Абаротныя сродкі накіроўваем пераважна на набыццё абсталявання для далейшай мадэрнізацыі і тэхнічнага пераўзбраення нашых аб'ектаў — як гандлёвых, так і грамадскага харчавання, нарыхтоўчых пунктаў.

Дарэчы, цяпер у склад прадпрыемства ўваходзіць 11 рознічных гандлёвых аб'ектаў. У іх ліку сем прадуктовых, тры непрадуктовыя і адзін сумежны магазіны. У структуры «Палесся» — і чатыры аб'екты грамадскага харчавання. Гэта рэстаран «Палессе», кафэ

і міні-кафэ на 236 пасадачных месцаў, аддзел кулінарыі «Ласунак». Паводле слоў Наталлі Семянюк, стратэгія развіцця прадпрыемства скіравана на ўмацаванне ўласнай матэрыяльнай базы, пастаяннае ўдасканаленне гандлёвай сеткі, у тым ліку рацыянальнае выкарыстанне гандлёвых плошчаў, пашырэнне асартыментнага пераліку на аснове маркетынгавых даследаванняў. За апошнія гады амаль цалкам удалося абнавіць усё тэхналагічнае абсталяванне аб'ектаў гандлю і грамадскага харчавання, парк аўтатранспарту, аўтаматызаваць гандлёвы працэс. На прадпрыемстве актыўна папрацавалі над укараненнем безнаяўных разлікаў пакупнікоў, і цяпер па колькасці разлікаў банкаўскімі плацежнымі карткамі маюць бадай найлепшы паказчык сярод гандлёвых прадпрыемстваў Мазырскага раёна. У самой кампаніі ўжо некалькі гадоў паспяхова функцыянуе камп'ютарная праграма з цэнтральным офісам, якая дапамагае дэталёва аналізаваць продажы і эфектыўнасць правядзення розных акцый, адсочваць рух тавару.

Маркетынгавыя акцыі, дарэчы, шырока прымяняюцца ў гандлёвых аб'ектах «Палесся». «Адзіны дзень зніжак», промаакцыі, распродажы, рэкламныя гульні — тут па максімуме выкарыстоўваюць усе тыя сучасныя інструменты, якія дазваляюць прывабіць пакупнікоў. Штомесяц, напрыклад, у наведвальнікаў магазінаў ёсць магчымасць набыць са зніжкамі ад 15 да 40 % тавары прадпрыемстваў канцэрнаў «Беллегпрам» і «Белдзяржхарчпрам». Можна атрымаць зніжкі і па накапляльнай дысконтнай праграме «Маё Палессе», існуе і праграма падарункавых сертыфікатаў. Даступна для пакупнікоў набыццё тавару ў крэдыт з растэрміноўкай плацяжу. Менавіта такія падыходы дазваляюць паспяхова канкурыраваць з вядомымі буйнымі гандлёвымі сеткамі.

Акрамя правядзення гібкай цэнавай палітыкі, рэкламных акцый і выставак-продажаў, важная і культура абслугоўвання пакупнікоў, якую на прадпрыемстве пастаянна ўдасканальваюць. І вялікую ролю ў гэтым адыграе высокі прафесійны ўзровень усяго калектыву, яго творчы падыход і імкненне да ўкаранення сучасных стандартаў гандлю.

УНП 400082468

ЗАБЯСПЕЧЫЦЬ САМЫЯ ПАТРАБАВАЛЬНЫЯ ЗАПЫТЫ

У сённяшніх умовах рынак патрабуе індывідуальнага падыходу да кожнага пакупніка і яго спажывецкіх магчымасцяў, а ва ўмовах жорсткай канкурэнцыі ключавымі фактарамі становяцца не толькі цэны, але і формы абслугоўвання, асартымент і нават дызайн магазіна. Гэта выдатна ведаюць на адным з найбуйнейшых гандлёвых прадпрыемстваў Мазыршчыны — «Прыпяцкім Альянсе».

Сёння ў структуры кампаніі больш за сотню магазінаў. А іх агульная плошча — амаль 11,5 тысячы м². Яны знаходзяцца не толькі ў Мазырскім, але і ў суседнім Нараўлянскім раёне, а таксама ў Мазыры, Калінкавічах, Нароўлі, Ельску і Рэчыцы і абслугоўваюць больш за 30 тысяч насельніцтва. Прычым прадпрыемства выконвае важную сацыяльную місію — аказвае паслугі ў аддаленых населеных пунктах, дзе жывуць у асноўным пажылыя людзі, і атрымаць асаблівы прыбытак там немагчыма. Менавіта 70 магазінаў кампаніі (а гэта амаль 70 %) знаходзяцца ў сельскай мясцовасці, куды не спяшаюцца прыходзіць іншыя гандлёвыя прадпрыемствы. А восем аўталавак абслугоўваюць жыхароў 75 вёсак, дзе пражывае больш за 2 тысячы чалавек і няма стацыянарных гандлёвых сетак.

У буйных крамах гандлёвай сеткі «Прыпяцкі Альянс» праводзяцца разнастайныя маркетынгавыя мерапрыемствы: акцыі «Кошт тыдня» і «Кошт дня», «Дзень скідак», сезонныя распродажы. Арганізаваны і продаж тавараў у крэдыт з адтэрміноўкай плацяжу — па картках «Лёгкія пакупкі», «Халва», «Магніт». Але сёння, калі ў пакупніка шырокі выбар гандлёвых сетак, вялікае значэнне мае не толькі канкурэнтаздольны кошт, але і прывабны асартымент тавараў. Таму калектыў прадпрыемства працуе над мультыфарматнасцю: у спальных раёнах горада пакупнік аддасць перавагу таму магазіну, дзе купіць можна ўсё — ад хлеба і малака да зубачыстак і сурвэтак. Важную ролю адыгрывае і інтэр'ер самога магазіна. Таму значную долю сродкаў прадпрыемства інвестуе ў мадэрнізацыю гандлёвых аб'ектаў. Летась былі прыведзены ў адпаведнасць з сучаснымі стандартамі магазін № 8 «Прыпяцкі» і магазін у вёсцы Меляшковічы. А прамысловы магазін «Палескі» пераўтварыўся ў сучасную кандытарскую «Салодкі церам». Новае абсталяванне з'явілася яшчэ ў шасці гандлёвых аб'ектах. Сёлета гэта работа будзе працягнута, плануецца мадэрнізаваць яшчэ чатыры крамы ў сельскай мясцовасці з поўнай заменай абсталявання.

У сферы інтарэсаў кампаніі «Прыпяцкі Альянс» не толькі аптовы і рознічны гандаль, але і грамадскае харчаванне, нарыхтоўчая дзейнасць, аказанне транспартных паслуг і перавозка грузаў, здача ў наём нерухомасці і знешнеэканамічная дзейнасць. У структуры кампаніі 24 прадпрыемствы грамадскага харчавання ў Мазырскім і Нараўлянскім раёнах. Жыхары і госці Нароўлі выдатна ведаюць утульны сучасны бар «Таверна». А мазыране аблюбавалі кафэ «Шампань», у тым ліку — і за яго акцыі «Страва тыдня», «Дні беларускай кухні», «Рыбны дзень». Акрамя кафэ і рэстаранаў у склад уваходзяць бары, сталовыя, закусачныя, буфеты. Дарэчы, 13 такіх аб'ектаў знаходзяцца ў сельскай мясцовасці. Летась тэмп росту тавараабароту прадпрыемстваў грамадскага харчавання склаў 103,3 %.

Перавыканана заданне па нарыхтоўчым абароце. Летась ён склаў 2 918 тысяч рублёў, што на 10,5 % больш, чым у 2016-м, і на 6,5 % вышэй за даведзены паказчык. У прадпрыемства 10 прыёма-нарыхтоўчых пунктаў, склады другаснай сыравіны і сховішча садавіны і агародніны. Яно, дарэчы, абсталявана рэгуляваным мікракліматам і сучаснай спліт-сістэмай, якая дазваляе доўгі час захоўваць плода-агароднінную прадукцыю без страты яе спажывецкіх якасцяў.

Спыняцца на дасягнутым на прадпрыемстве не збіраюцца. Развіццё і ўдасканаленне матэрыяльна-тэхнічнай базы, у прыватнасці далейшая мадэрнізацыя аб'ектаў гандлю, фарміраванне прывабнага асартыменту па канкурэнтаздольных цэнах, павелічэнне рознічнага таваразвароту — такія задачы ставіць перад сабой кіраўніцтва і калектыў «Прыпяцкага альянсу». Але галоўная з іх — забяспечыць самыя разнастайныя патрэбы пакупнікоў.

УНП 400210619

ГОРНЫЯ СПУСКІ ЗАХОПЯЦЬ ДУХ

Цела ўмацуюць, а настрой — падымуць. Асноўны спартыўна-аздараўленчы аб'ект горада над Прыпяццю — гарналыжны комплекс «Мазыр», зараз актыўна прымае як жыхароў, так і гасцей горада.

— Сёлета ўжо звыш 13 тысяч чалавек паспелі скарыстацца яго паслугамі, — расказвае метадыст аддзела адукацыі, **спорту і турызму Мазырскага райвыканкама Галіна КАСЦЯШКІНА.** — А гэта азначае, што комплекс зарабіў 55 тысяч рублёў. Умовы надвор'я дазволілі адкрыць каток для наведвальнікаў толькі ў сярэдзіне студзеня, але ж вельмі шмат людзей магчымасцю пакатацца скарысталіся.

Для тых, хто аддае перавагу імклівым горным спускам, — траса працягласцю каля 200 метраў, шырынёй 30 метраў і перападам вышынь 28 метраў. Старт сезона снаўбордаў і лыж крыху зацягнуўся з-за капрызаў надвор'я, але ж наперадзе яшчэ сакавік і практычна да яго канца можна паспець атрымаць асалоду

ад спуску з гары з ветрыкам. Між тым пачаткоўцы могуць узяць першыя ўрокі непасрэдна на гарналыжным комплексе: тут працуюць інструктары для дарослых і дзяцей.

Спартыўна-аздараўленчы гарналыжны комплекс «Мазыр» працуе з 2006 года. Гарналыжная база размяшчаецца ў цэнтры горада, што вельмі зручна для ту-

У Мазырскім раёне развіваецца 32 віды спорту, з іх 17 — па алімпійскай праграме. Найбольш масава: веславанне на байдарках і каноэ, валейбол, футбол, цяжкая атлетыка, бокс, вольная і грэка-рымская барацьба, акадэмічнае веславанне, лёгкая атлетыка, веласпорт, каратэ, акрабатыка. У склад нацыянальных камандаў уваходзіць 86 спартсменаў Мазырскага раёна.

рыстаў. Комплекс прапануе кліентам самы разнастайны адпачынак. Дзеці з задавальненнем катаюцца на спецыяльна абсталяванай цюбінгавай трасе. А дарослыя могуць пакатацца не толькі на лыжах, але і на снаўбордах. Пры гэтым увесь рыштунак можна ўзяць напракат тут жа. Горныя лыжы, канькі, снаўборды і цюбінгі для дзяцей ва ўзросце ад трох гадоў і практычна любыя памеры для дарослых. Катацца можна і на сваіх, але абавязкова купіць білет для ўваходу на лёд. Акрамя таго, арганізатары прапануюць яшчэ і катанне на снегаходзе. Дарэчы, якасць трас забяспечвае спецыяльная снежная гармата магутнасцю 50 кубаметраў штучнага снегу за гадзіну. Яна здольная стварыць снежны полаг на палескім гарналыжным курорце. А тым, хто стаміўся ці замерз, можна выпіць кубачак гарбаты ва ўтульнай мясцовай кавярні.

Матэрыялы выпуску падрыхтавалі Святлана СУШКО, Вольга ГЕЦЭВІЧ, Ірына АСТАШКЕВІЧ, Алена КРАВЕЦ. Фота Ганна ЗАНКАВІЧ і з архіваў прадпрыемстваў.